## Неруш

Тут не сякуць дрэў, не прыбіраюць буралом, не паляць вогнішчаў, і нават у самы багаты на грыбы і ягады сезон, за імі палююць толькі адзінкі людзей, хоць тыя ж журавіны, мясцовыя расказваюць, раней адсюль вывозілі вазамі. У непраходным лесе, які пранізвае вялікая колькасць ручаёў і які перамяжоўваецца з балотамі, кватаруе вялікая колькасць разнастайных звяроў і птушак, многіх з якіх рэдка дзе можна пабачыць. Так, з 75 відаў, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, тут сустракаецца 58. У некранутай прыродзе, дзе сярод паваленага сучча і дрэў няцяжка знайсці зацішнае мястэчка, нядрэнна адчуваюць сябе беларускія чырванакніжнікі — рысь, барсук і буры мядзведзь. Сляды апошняга, а то і яго самога, без праблем можна пабачыць, бо гаспадараць у гэтых лясах каля трох дзясяткаў касалапых. Тут ёсць мясціны, у якіх звяры на людзей глядзяць, як на дзіва, бо ў самае сэрца гэтага царства з дрэў і вады чалавек трапляе крайне рэдка. І менавіта тут можна ўявіць Беларусь — спрадвечную, натуральную, неўтаймаваную. Тую, якой яна была некалькі стагоддзяў таму.

Тут існуюць свае запаветныя законы і бясконца тчэцца непаўторнае палатно прыроднага сусвету, дзе не чалавек, а нейкая вышэйшая сіла вырашае, якіх дэталяў і фарбаў сюды дадаць. А людзям застаецца толькі назіраць, вывучаць і бясконца дзівіцца творчым здольнасцям матухны прыроды.

Бярэзінскі біясферны запаведнік — прыродаахоўная ўстанова Упраўлення справамі прэзідэнта— адзін з самых вялікіх у Еўропе. Яго плошча складае больш як 85 тысяч гектараў, размясціўся ён на тэрыторыі трох раёнаў Беларусі — Лепельскага, Докшыцкага і Барысаўскага. З вышыні птушынага палёту летам ён падаецца бясконцым зялёным дываном, прашытым блакітнымі ніткамі рэк, якіх тут 69, узорамі азёраў (буйнейшыя з якіх — Плаўна, Палік, Манец, Дамжэрыцкае).

Тут віляе Бярэзіна з вялікай колькасцю старыц і пойменых азёраў, тут яна падсілкоўваецца каля 70 прытокамі. Агульная працягласць Бярэзіны ў межах запаведніка каля 110 кіламетраў, яна з’яўляецца адзінай ракой з запаветным рэжымам ў нашай краіне, дзе забаронена суднаходнасць, сплаў лесу. Калісьці тут праходзіў шлях з варагаў у грэкі. У 1797—1805 гадах на месцы старажытнага шляху была пабудавана водная сістэма, якая дазваляла правозіць тавары, сплаўляць лес з паўночнай часткі Мінскай губерні да Прыбалтыкі, яднала воды Дняпра і заходняй Дзвіны. У межах Бярэзіны водная сістэма пачыналася Сергуцкім каналам, які эксплуатаваўся яшчэ да пачатку Другой сусветнай вайны. А сёння большая яго частка абмялела і заглеілася, і гаспадараць тут шматлікія птушкі, выдры ды бабры. Менавіта для захавання апошніх і стварыўся Бярэзінскі запаведнік. Раней бабёр масава вынішчаўся людзьмі, прычым не толькі дзеля шкурак і мяса (прынамсі, каталіцкай царквой бабёр прыраўноўваўся да рыбы і ў час пастоў "трапляў на стол" да вернікаў). Вельмі цаніўся бабровы струмень, ён выкарыстоўваўся ў медыцыне пры лячэнні нервовых, сардэчна-сасудзістых захворванняў, хваробаў мочапалавой сістэмы, паралічу і залечванні ранаў, а таксама пры стварэнні стойкіх духоў. Пастаянныя паляванні на бабра прывялі да таго, што ён мог знікнуць у нашай краіне, невялікія групы яго захоўваліся толькі ў самых аддаленых кутках Беларусі, у тым ліку і ў вярхоўях Бярэзіны. Але цяпер бабровыя хаткі без праблем можна пабачыць у розных водных мясцінах запаведніка. Стварэнне ахоўнай тэрыторыі паспрыяла і таму, што бабры распаўсюдзіліся па ўсёй Беларусі.

Бярэзінскі — адзіны запаведнік на тэрыторыі Беларусі і адзін з найстарэйшых ахоўных аб’ектаў у Еўропе. Заснаваны ў 1925 годзе, ён атрымаў сусветную вядомасць як эталон некранутай прыроды.

Гэтыя мясціны тояць шмат сакрэтаў, якія здольны ўразіць нават самых дасведчаных даследчыкаў прыроды. Таму запаведнік прываблівае навукоўцаў і проста аматараў экатурызму (які ўсё больш распаўсюджваецца на Захадзе) з розных краін. Так, Жан Клод Жэно (супрацоўнік французскага біясфернага

запаведніка "Паўночныя Вагезы"), які ў гэты час гасцяваў у беларускім запаведніку, прызнаўся, што прыязджае сюды ўжо сямнаццаты раз і быў адным з першых еўрапейскіх натуралістаў, якія наведвалі гэтыя мясціны. Жан адзначыў, што бываў у розных унікальных кутках Еўропы, але наша прырода найбольш захаваная, і ён лічыць, што Бярэзінскі запаведнік — даволі прываблівая мясціна для еўрапейцаў: навошта ехаць па дзікую прыроду некуды за акіян, калі яе можна знайсці побач, у Беларусі?

**Рай для турыстаў**

Сэрца некранутай Беларусі цяпер асабліва пульсуе. Прыродны спакой напоўнены спевамі шматлікіх птушак. Якраз самы час, калі такуюць, забаўляюць самак цецерукі і глушцы. І людзі, якія наведваюць запаведнік, пры жаданні змогуць паназіраць за птушыным вясельным сезонам. Па лясах і балотах вандруюць казулі і алені, ласі і зубры, кабаны і ваўкі. На балотах яшчэ захаваліся журавіны, хоць з восені імі ласавалася вялікая колькасць разнастайных птушак і жывёл. Журавіны, якія перажылі зіму, лічацца самымі смачнымі. Вадаёмы поўняцца рыбай, якой тут больш за 30 відаў (сярод іх сом, лешч, шчупак, судак, мянтуз). Бязмежныя лясы, балоты і ўнікальная пойма Бярэзіны — ідэальныя ўмовы для пражывання вялікай колькасці відаў, якія яшчэ неккалі былі распаўсюджаным і Еўропе, а сёння з'яўляюцца рэдкімі або зніклі наогул. Між іншым, тут сустракаецца 56 відаў млекакормячых, 230 птушак, 6 паўзуноў, 11 земнаводных і больш за дзве тысячы відаў раслін. Тут распрацаваны спецыяльныя экскурсіі, пры жаданні можна забрацца на назіральную вышку ці седзячы у засадзе цікаваць за запаветным светам.

А можна прама завітаць да лясных жывёл — у вальерах жывуць зубр, казулі, ваўкі і іншыя жывёлы, куды мы і выпраўляемся. Мясцовая знакамітасць, мядзведзіца Машка, пра якую расказваюць, што яна, каб выпрасіць цукерку, гатова наладзіць цэлы паказ, ляжыць ў вальеры. Прыгрэла сонейка і, відаць, ёй не надта хочацца перарываць свой адпачынак дзеля нейкіх там турыстаў. А вось алень Яшка, наадварот, падабраўся бліжэй да нас — можна было нават дакрануцца да яго маленькіх аксаміцістых рожак (старыя, галінастыя, ён нядаўна скінуў)...

Пасля аглядных экскурсій добра падацца на рыбалачку, кажуць, тут неблагі клёў. Ці проста, паспрабаваць высачыць якога жыхара гэтых лясоў, рэк ды балот, пасядзець у альтанцы на беразе возера Плаўна, па хвалях якога вандруюць незвычайныя "караблі" — адарваныя ад зямлі кусты. Яны плаваюць ад аднаго берега да другога (адсюль, магчыма, і назва вадаёма). Мясціны гэтыя — проста песня.

**Ой, што будзе**

Чатыры з паловай месяцы таму ў Бярэзінскім запаведніку з'явіўся новы дырэктар —Віктар Анікеенка. Ён актыўна узяўся за добраўпарадкаванне мясцовых турыстычных аб'ектаў — вядзецца рамонт у гасцініцы Сергуч, будзе аднаўляцца тэрыторыя вакол яе, наводзіцца парадак у дэндрапарку, за якім будуецца возера, у спякотнае надвор'е тут можна будзе пакупацца, з'явіцца валейбольная і дзіцячая пляцоўкі, закупляюцца лодкі і катамараны, распрацоўваюцца новыя маршруты — пешыя, веласіпедныя і водныя (апошнія плануецца рабіць як на адзін, так і на два дні з прыпынкамі ў чароўных мясцінах). Асноўныя работы абяцаюць завяршыць да 1 чэрвеня.

Будуюцца новыя гасцявыя домікі на базе адпачынку "Ніўкі". Гэтае месца заўсёды карысталася асаблівым попытам, парыбачыць і папаляваць у гэтых краях (у склад ДПУ "Бярэзінскі біясферны запаведнік" уваходзяць эксперыментальная лесапаляўнічая гаспадарка "Барсукі" і паляўнічая гаспадарка "Бярэзіна", на тэрыторыі якіх і вядзецца гаспадарчая дзейнасць, а самі запаветныя мясціны не кранаюцца) прыязджаюць не толькі суайчыннікі, але і прадстаўнікі краін блізкага і далёкага замежжа.

— Чаму ўзяліся за будаўніцтва гэтых домікаў? — разважае дырэктар. — Я сам заядлы паляўнічы і рыбак, і ведаю, што такія людзі не хочуць лезці ў палацы. Ім утульней у катэджыках, дзе можна сабрацца невялікай кампаніяй, прыгатаваць ежу са сваіх трафеяў. І, вядома ж, ім патрэбны добрыя ўмовы для таго, каб заняцца любімай справай. А часта

атрымліваецца, што рыбаку даводзіцца грузіць на сябе гумавую лодку і цягнуць яе да ракі па тваністай мясцовасці. Пасля рыбачыць брудным і мокрым. Хіба ж гэта сервіс?

Хвіліны дзве мы ідзём да альтанкі каля ракі па ўжо створаным драўляным насціле, які пракладзены праз суцэльны водны свет, зарослы разнастайнай балоцістай раслiннасцю. Спрабую ўявіць рыбака, які прабіраецца падобнымі мясцінамі не па трапу, а па вадзе... Не, у гэтай твані добра сябе адчуваць могуць толькі жабы.

А вось мы на пляцоўцы, дзе будуецца турыстычная міні-вёска з катэджаў. Усяго тут будзе 7 домікаў, якія змогуць прыняць 35 чалавек. У кожным катэджы — санвузел, душ з гарачай вадой, ацяпленне, кухня. Для не надта патрабавальнага турыста — якраз тое, што трэба. Тут будуць функцыянаваць і 2 лазні (адна з іх — для тых, хто любіць "па-чорнаму"). Домікі пад ключ плануецца здаць зноў жа да 1 чэрвеня. Паступова будуць абсталяваны і месцы пад барбекю, шашлычніцы, з’явіцца дзіцячая пляцоўка. Ужо пастаўлена некалькі новых зрубаў, паміж брыгадамі, якія ўзводзяць гэтыя дамы, нават узнікла нешта наконт спаборніцтва — хто здасць свой будынак першым. А між іншым, працуюць тут людзі, якія да таго ніколі ў жыцці не будавалі. Праінструктаваныя спецыялістамі, у стварэнні катэджаў занятыя леснікі. Такім чынам вырашаецца шэраг пытанняў. Адно з якіх — недахоп рабочых рук, вельмі цяжка было знайсці будаўнікоў у гэтай мясцовасці. Другое, тутэйшыя супрацоўнікі атрымалі магчымасць падзарабіць.

Прынамсі, арэнда катэджа ў "Ніўках" (зараз там працуе пабудаваны раней домік на 10 чалавек) — 210 тысяч. Пытаюся ў намесніка дырэктара па турызме Святланы Верасавой, а ці можна сюды заказваць гатовую ежу. Высвятляецца, што няма праблем, можна яе або падвозіць з гасцінічнага комплексу "Плаўна", або дамовіцца, каб кухар жыў тут і гатаваў турыстам.

— А ці магчыма прыехаць сюды на адпачынак з палаткамі? — дапытваю далей Святлану Васільеўну.

— Так, трэба толькі загадзя дамовіцца з нашымі супрацоўнікамі і заключыць дамову, бо лавіць рыбу і нават проста збіраць ягады на гэтай тэрыторыі могуць альбо мясцовыя жыхары, альбо людзі, якія пражываюць у гасцінічных комплексах запаведніка.

— А ці можна ў "Бярэзінскі" ехаць сем’ямі, браць малых дзяцей?

— Безумоўна, дзецям вельмі падабаецца ў нас адпачываць. Мы гатовыя прадастаўляць дзіцячыя ложкі, ствараць меню для малых. І людзі, якія былі тут мінулым летам, нават цяпер пачынаюць цікавіцца пра нумары. Прынамсі, летам месцаў на ўсіх ахвотных можа і не хапіць. Але мы прымаем турыстаў круглы год.

— А якімі стравамі вы гатовы пачаставаць турыстаў?

— Зразумела, у нас ёсць традыцыйная беларуская кухня. Але мы маем і свае асаблівасці — стравы з дароў лесу і ракі. Гэта юшка, фаршыраваная рыба, мясныя стравы з дзічы (ласяціны, кабаніны).

— А чым яшчэ можаце здзівіць, мо ў вас і лесавік свой ёсць?

— Пакуль няма, але мы думалі ў гэтым напрамку. А вось маршрут камянямі жаданняў з гэтага года будзе...

Днямі пацікавілася ў свайго знаёмага: твае першыя асацыяцыі пра турызм у Беларусі? І пачула: "Убогія нумары, саўдэпаўскія сталоўкі... Але многія з тых асобаў, якія наракаюць на адсутнасць турыстычнай інфраструктуры ў Беларусі, ніколі не выбіраліся далей сваіх... дач. А людзям, якія працуюць у гэтай галіне, ужо ёсць чым уразіць пераборлівых турыстаў. Вы зразумееце, што я маю на ўвазе, калі наведаеце гасцінічны комплекс Бярэзінскага запаведніка "Плаўна". Гэта былая дача першага сакратара ЦК кампартыі Беларусі Пятра Машэрава, а цяпер трохпавярховая гасцініца, якая нагадвае казачны замак. Прасторныя ўтульныя нумары арыгінальна аформленыя, від з акон — не налюбуешся. Інтэр’ер рэстаранчыка з камінам нічым не горшы, чым у турэцкіх "пяцізорках", і гатуюць тут смачна: юшка і шашлычок прыйдуцца даспадабы гурманам, а паспрабавалі б вы мясцовы журавінны морс...

Бясспрэчна, тут спрабуюць падстройвацца пад патрэбы турыстаў. Тут адкрыты новым ідэям. Планы і размах работ уражваюць. Гэта калі столькі усяго ўжо

зроблена невялікімі сіламі за лічаныя месяцы, на што ж здольная каманда запаведніка. Верыцца, што яны змогуць пераламаць стэрэатыпы пра адсутнасць нармальнага сэрвісу на тэрыторыі Беларусі.

***Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-7 мая.-С.6.